Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 41 (110)
АЎТОРАК
20
ЛЮТАГА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

Прывітанне ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР работнікам совецкай кінематаграфіі

ЦК ВКП(б) і СНК Саюза ССР вітаюць работнікаў совецкай кінематаграфіі, адзначаючай сваё дваццацігоддзе.

За дваццаць год існавання совецкай кінематаграфіі атрыманы значныя перамогі. Совецкае кіно вырасла ў вялікую ідэйна-мастацкую сілу і стала магутным сродкам комуністычнага выхавання мас.

ЦК ВКП(б) і СНК СССР заклікаюць кінаработнікаў развіваць і рухаць уперад самае важнае і масавае з мастацтваў — кіно, даваць краіне больш высокамастацкіх і іншых, патрэбных для ўсебаковага культурнага ўздыму працоўных, карцін, ярка адлюстроўваючых гістарычнае мінулае народаў СССР і эпоху соцыялізма, праслаўляючых поспехі і гераічныя подвігі совецкіх людзей, мабілізуючых наш народ на перамаганне цяжкасцей нашага будаўніцтва і на далейшую беззаветную барацьбу за таржаство комунізма.

ЦК ВКП(б). СНК Саюза ССР.

Пагадненне, адказваючае інтарэсам СССР і Германіі

У перадавым артыкуле „Правды", прысвечаным заключанаму 11 лютага гаспадарчаму пагадненню паміж Германіяй і СССР, падкрэсліваецца выключная важнасць гэтага пагаднення. Прадугледжваючы вываз з СССР у Германію прамысловай сыравіны і харчоў у абмен на вываз з Германіі ў СССР прамысловых вырабаў, у тым ліку прадметаў узбраення, яно выгадна абоім старанам.

— Сучасная Германія, — піша „Правда", — высока развітая індустрыяльная краіна; яна ўладае магутнай тэхнікай, багата сваёй машынабудаўнічай і хімічнай прамысловасцю. Але і індустрыя Германіі мае патрэбу ў большай колькасці сыравіны. Патрэба Германіі ў сыравіне ў значнай меры можа задаволіць СССР. Совецкі-ж Саюз, не гледзячы на каласальны рост уласнага машынабудаўніцтва, прадаўжае адчуваць вялікую патрэбу ў прамысловым абсталяванні, бо грандыёзны задачы соцыялістычнага будаўніцтва, якія начартаны ў плане трэцяй пяцігодкі і ў перспектыве яшчэ больш буйнага індустрыяльнага ўздыму краіны на наступныя пяцігодкі. Выкананне эканамічнай задачы СССР — дагнаць і перагнаць галоўныя капіталістычныя краіны ў эканамічных адносінах, натуральна, павялічвае попыт на прамысловыя вырабы іменна такога роду, якія вытвараюцца ў Германіі.

Далей „Правда" адзначае важнасць заключанага гаспадарчага пагаднення для далейшага расшырэння знешняга гандлю Совецкага Саюза. Трэба мець на ўвазе, што гандаль СССР з Англіяй і Францыяй значна паменшыўся. Дзейнічаючы наперакор сваім уласным нацыянальным інтарэсам, Англія і Францыя яшчэ да пачатку вайны ануліравалі рад совецкіх заказаў, размешчаных у свой час у гэтых краінах. Апрача таго, такога роду факты, як нядаўна арганізаваны ўрадам Францыі паліцэйска-бандыцкі налёт на совецкае торгпрадства ў Парыжы, напамінаючы арганізаваны англічанамі ў 1927 годзе налёт на совецкае торгпрадства ў Лондане, не даюць магчымасці весці колькі-небудзь нармальны гандаль з Францыяй.

Перадавы заканчваецца словамі:

„Усе заключаныя ў апошнія месяцы дагаворы паміж Германіяй і СССР, — дагавор аб ненападзе, пакт аб дружбе і граніцы і, нарэшце, гаспадарчае пагадненне, — стварылі моцную, надзейную базу для развіцця эканамічных і палітычных дружаственых сувязей абоіх дзяржаў. Яны поўнасцю адпавядаюць карэнным інтарэсам совецкага і германскага народаў, інтарэсам міру, інтарэсам народных мас усіх краін".

АПЕРЗВОДКІ ШТАБА ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВАЕННАЙ АКРУГІ

На працягу 17 лютага на Карэльскім перашэйку пад ударамі нашых часцей праціўнік, несучы вялікія страты, спальваючы сёлы, паспешна адступаў у бок Выбарга к усходу ад яго.

Нашы часці занялі: горад ОЙКОЛА (на паўночным беразе возера Муола-Ярві), станцыю СЯІНІЕ ў 6 кілометрах на паўднёвы ўсход Выбарга, умацаваны вузел КАРХУЛА—на захад да раёна Сумма і гарады — НАР'Я і МУРЫЛА ў Прыморскім раёне.

Праследванне праціўніка прадаўжаецца па ўсяму фронту.

На астатніх участках фронта не адбылося нічога істотнага.

Наша авіяцыя вяла актыўныя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка.

* * *

На працягу 18 лютага на Карэльскім перашэйку наша наступленне прадаўжала паспяхова развівацца. Пад націскам нашых часцей праціўнік прадаўжае адступаць.

Нашы часці вышлі на раку САЛМЕН-КАЙТА паміж азёрамі ВУОКСІ-ЯРВІ і ЯЮРАПЯЯН-ЯРВІ, занялі: умацаваны пункт і сяло МУОЛА, станцыю СОММЭ Прыморскай чыгункі ў 10 к. на поўдзень ад Выбарга, гор. ЮХАНЕС і станцыю МАКСАЛАХЦІ Прыморскай чыгункі, вышаўшы такім чынам на заходняе ўзбярэжжа Фінскага заліва на поўнач ад вострава БІОРКЕ.

За 17 і 18 лютага нашымі войскамі заняты 313 абаронных умацаваных пунктаў праціўніка, з іх 41 жалезабетоннае артылерыйскае збудаванне, а ўсяго пачынаючы з 11 лютага па 18 лютага ўключна, нашымі часцямі ўзята 475 абаронных умацаваных пунктаў праціўніка, з іх 92 жалезабетонных артылерыйскіх збудаванні.

На астатніх участках фронта без істотных змен.

Наша авіяцыя вяла актыўныя баявыя дзеянні па войсках і ваенных аб'ектах праціўніка. У адбыўшыхся паветраных баях збіт 21 самалёт праціўніка.

АКРУГОВЫЯ ПРАДВЫБАРЧЫЯ НАРАДЫ

АКРУГОВАЯ НАРАДА ЎПАЎНАВАЖАНЫХ 581 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ АДНАДУШНА ПАДТРЫМАЛА ПРАПАНОВУ МНОГАЛІКІХ СХОДАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫЛУЧЭННІ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

ТУРЛЕЙСКАГА ІВАНА АНТОНАВІЧА

Учора ў Доме партыйнай асветы г. Беластока адбылася акруговая прадвыбарчая нарада ўпаўнаважаных 581 акругі па выбарах дэпутатаў у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР. На акруговую нараду з'явілася 245 чалавек, выбраных на агульных сходах тэкстыльшчыкаў, фанершчыкаў, чыгуначнікаў Беластока, чыгуначнікаў ст. Лапы, сялян Бельскага, Кольнаўскага, Чыжаўскага, Граеўскага і іншых раёнаў.

Пад бурныя апладысменты нарада выбрала ў ганаровы прэзідыум Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным.

З дакладам аб чарговых задачах выбарчай кампаніі выступіў старшыня акруговай камісіі тав. Сямёнаў:

— Пасля даклада пачаліся выступленні. Слова атрымаў слесар дэпо Беласток тав. Шварцман.

Сваім кандыдатам чыгуначнікі Беластока вылучылі тав. Турлейскага, які, не гледзячы на сваю маладосць, прымаў актыўны ўдзел у рэволюцыйнай барацьбе за справу працоўных. Польскі ўрад няздарма трымаў яго ў турмах, ганяў яго па краіне з воўчым білетам. Гэта не зламала волю тав. Турлейскага. Ён застаўся верным народу. Тав. Турлейскі быў выбран дэпутатам Народнага Сабрання і членам Паўнамочнай Камісіі. Ён поўнасцю апраўдаў ускладзенае на яго давер'е. Мы ўпэўнены, што і зараз тав. Турлейскі апраўдае давер'е працоўных, і таму прапануем падтрымаць яго кандыдатуру ў дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

Кандыдатуру тав. Турлейскага падтрымалі ў сваіх выступленнях тт. Хрустоўскі, Вырвас, Паталоўскі і іншыя.

На нарадзе выступіў тав. Турлейскі І. А., які сказаў:

— Таварышы! 5 месяцаў мінула з таго часу, як развалілася польская дзяржава, самое стварэнне якой было антысовецкай правакацыяй лонданскіх і парыжскіх імперыялістаў. Рэволюцыйная Польшча рабочых і сялян, узнікаўшая ў рэзультаце Кастрычніцкай рэволюцыі, была знішчана з дапамогай англійскага і французскага капітала. Але дарэмныя былі іх стараннi. Польшча пілсудскіх, бекаў і рыдз-сміглых, Польшча памешчыкаў і капіталістаў развалілася як картачны домік.

Я хачу расказаць аб сабе. Нарадзіўся я ў 1913 годзе ў гор. Лодзі ў сям'і рабочага паляка. Там-жа, у Лодзі, скончыў сярэднюю школу і паступіў на вучобу ў Варшаўскі палітэхнікум. За рэволюцыйную дзейнасць я неаднаразова падвяргаўся ганенням з боку паліцыі. У апошні раз за арганізацыю першамайскай дэманстрацыі ломжынскіх рабочых быў арыштаваны і падвергнуты двухгадоваму турэмнаму зняволенню. Па выхаду з турмы атрымаў воўчы білет.

Прыход Чырвонай Арміі вызваліў мяне, як і ўвесь народ заходніх абласцей Украіны і Беларусі, з-пад іга панскай Польшчы.

Я даю слова працаваць, не пакладаючы рук, на блага нашай соцыялістычнай радзімы.

У прынятай рэзалюцыі гаворыцца:

— Акруговая прадвыбарчая нарада цалкам і поўнасцю падтрымлівае кандыдатуру ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР па Беластоцкай выбарчай акрузе № 581 тав. Турлейскага Івана Антонавіча, выстаўленага рабочымі і служачымі тэкстыльнага камбіната № 2, чыгуначнікамі ст. Беластока, рабочымі Ломжынскага завода сельгасмашын і сялянамі Бельскага і іншых раёнаў.

Акруговая нарада бярэ на сябе абавязацельства агітаваць за Турлейскага І. А., як за дастойнага кандыдата сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Пад бурныя апладысменты і захапляючыя прывітальныя воклічы нарада прыняла пісьмо правадыру народаў таварышу Сталіну

Нарада прыняла зварот да ўсіх выбаршчыкаў 581 выбарчай акругі з заклікам аддаць свае галасы за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных.

Нарада выбрала 19 чалавек даверaных, якім даручана агітацыя сярод выбаршчыкаў за кандыдатуру тав. Турлейскага

АКРУГОВАЯ НАРАДА ЎПАЎНАВАЖАНЫХ 582 ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ АДНАДУШНА ПАДТРЫМАЛА ПРАПАНОВУ МНОГАЛІКІХ СХОДАЎ ПРАЦОЎНЫХ АБ ВЫЛУЧЭННІ КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

ПРЫТЫЦКАГА СЯРГЕЯ ОСІПАВІЧА

Гродна. (Ад нашага спецкора). 18 лютага адбылася акруговая прадвыбарчая нарада ўпаўнаважаных грамадскіх арганізацый 582 выбарчай акругі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР.

Нарада аднадушна прымае прапанову тт. Бандарэнка, Маўрына і Паўлюкевіча аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР тав. Прытыцкага Сяргея Осіпавіча. Кандыдатура тав. Прытыцкага падтрымана на многалікіх сходах рабочых і сялян 582 выбарчай акругі.

На нарадзе выступіў цёпла сустрэты прысутнымі тав. Прытыцкі. Ён шчыра дзякаваў за аказанае яму давер'е. Тав. Прытыцкі заявіў, что ён будзе працаваць так, як вучыць таварыш Сталін.

Нарада звярнулася да тав. Прытыцкага з просьбай даць сваю згоду для балатыроўкі ў дэпутаты Совета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Совета СССР.

Нарада ўпаўнаважаных выбрала даверaных, якія будуць весці агітацыю за кандыдата.

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Вячэславу Міхайлавічу Молатаву

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч!

Настаўнікі і тэхработнікі школ гор. Беластока ў гістарычны дзень, дзень абмеркавання і вылучэння кандыдатаў у дэпутаты соцыялістычнага парламента СССР і БССР на аснове найвялікшага ў свеце дакумента — Сталінскай Канстытуцыі, шлюць Вам, бліжэйшаму саратніку, лепшаму другу вялікага Сталіна, главе Совецкага ўрада, сваё гарачае прывітанне.

Незабываемым будзе для нас той дзень, калі Вы, Вячэслаў Міхайлавіч, у сваёй прамове 17 верасня 1939 года, сказанай па радыё, заклікалі Чырвоную Армію ўзяць пад абарону жыццё і маёмасць народаў Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, ажыццявілі тое, аб чым доўгія годы марылі гэтыя прыгнечаныя народы. Гэта па Вашаму заклiку магутная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія разграміла астаткі польскай ваеншчыны і на сваіх магутных стальных машынах прынесла народам Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны свабоду, радасць і шчасце.

Надыходзячыя выбары ў Вярхоўны Совет СССР на аснове Сталінскай Канстытуцыі гэта не проста ўсеагульныя, роўныя, прамыя пры тайным галасаванні выбары. Гэтыя выбары з'яўляюцца найбольш свабоднымі, найбольш дэмакратычнымі, две ажыццяўляецца ўсенароднае волевыяўленне.

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч! Абмяркоўваючы і вылучаючы кандыдатаў у дэпутаты соцыялістычнага парламента, звяртаемся да Вас, таварыш Молатаў, з просьбай, каб Вы далі згоду балатыравацца ў адной з выбарчых акруг гор. Беластока.

Аддаючы за Вас нашы галасы, мы аднадушна прагаласуем за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных, за шчаслівае, свабоднае жыццё, за росквіт СССР.

Няхай жыве совецкая ўлада!

Няхай жыве Сталінская Канстытуцыя!

Няхай жыве глава Совецкага ўрада Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў!

Няхай жыве наш друг і настаўнік вялікі, мудры Сталін!

Прынята аднагалосна на сходзе настаўнікаў г. Беластока 16 лютага 1940 г.

ТАВАРЫШ ПАНАМАРЭНКА П. К. — КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ СОВЕТА САЮЗА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР

15 лютага адбыўся многалюдны сход калектыва Баранавіцкага чыгуначнага дэпо, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР.

Слова атрымлівае пажылы кадравы машыніст-інструктар Д. В. Філімонаў:

— Мы павінны вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР чалавека, які змог-бы кіраваць вялікай творчай работай па ператварэнню заходніх абласцей у квітнеючыя вобласці ордэнаноснай Беларускай ССР. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета СССР па 606 выбарчай акрузе тав. Панамарэнка Панцелеймона Кандрацьевіча. Тав. Панамарэнка нарадзіўся ў 1902 годзе, член комуністычнай партыі з 1925 года, член Цэнтральнага Камітэта Ўсесаюзнай комуністычнай партыі большэвікоў, член Ваеннага Совета Беларускай Асобай Ваеннай Акругі. За заслугі перад радзімай краіна ўзнагародзіла тав. Панамарэнка ордэнам Леніна.

Мы ўсе добра ведаем таварыша Панамарэнка, як вернага большэвіка ленінска-сталінскага тыпа. Я вылучаю яго з поўнай упэўненасцю, што народ падтрымае маю прапанову, а таварыш Панамарэнка поўнасцю апраўдае наша давер'е.

Выступаўшыя затым рабочыя падтрымалі прапанову таварыша Філімонава аб вылучэнні таварыша Панамарэнка кандыдатам у депутаты Вярхоўнага Совета СССР.

У прынятай рэзалюцыі рабочыя просяць таварыша Панамарэнка даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Совета Саюза Вярхоўнага Совета СССР па 606 выбарчай акрузе. (БЕЛТА).

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ ПРАЦОЎНЫХ Гор. КОЛЬНА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Сямёнаў Гаўрыіл Іванавіч

(*На сходзе прысутнічала 400 чалавек*)

Адбыўся сход працоўных гор. Кольна, прысвечаны вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Слова для прапановы атрымаў рабочы электрастанцыі тав. Гембарскі. Ён сказаў:

— Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Сямёнава, сакратара Беластоцкага абкома КП(б)Б, адданага большэвіка. Я ўпэўнен, што тав. Сямёнаў апраўдае наша давер'е.

Выступіўшая на сходзе настаўніца тав. Лешчова падтрымала прапанову тав. Гембарскага.

Агульны сход аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Сямёнава Гаўрыіла Іванавіча і звярнуўся да яго з просьбай даць згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 329.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ СТАРАСЕЛЬСКАГА ВУЗЛА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Гершман Грыгорый Майсеевіч

(*На сходзе прысутнічала 550 чалавек*)

З вялікім уздымам прайшоў агульны сход рабочых і служачых Старасельскага чыгуначнага вузла. На сходзе з прапановамі аб вылучэнні кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР выступілі рабочыя тт. Іваноў, Пехоўскі і іншыя. Усе яны прапанавалі вылучыць кандыдатуру сакратара Беластоцкага гаркома партыі тав. Гершмана Грыгорыя Майсеевіча.

У аднадушна прынятай рэзалюцыі запісана: «Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Гершмана Грыгорыя Майсеевіча і прасіць яго даць сваю згоду балатыравацца па выбарчай акрузе № 359».

ВЫЛУЧЭННЕ КАНДЫДАТАЎ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНЫХ СОВЕТАЎ СССР і БССР

НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ ЧЫГУНАЧНІКАЎ ЛОМЖЫНСКАГА ВУЗЛА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Гладкоў Пётр Андрэевіч

(На сходзе прысутнічала 80 чалавек)

Ва ўтульным ленкутку сабраліся чыгуначнікі Ломжынскага вузла на сход, прысвечаны вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Слова для прапановы атрымлівае тав. Лібман.

— У Вярхоўны Совет БССР мы павінны паслаць дастойнага сына нашай радзімы, стойкага большавіка, да канца аданага вялікай справе Леніна—Сталіна. Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Гладкова Пятра Андрэевіча, выхаванца комуністычнай партыі, члена ВКП(б) з 1925 года. Зараз ён працуе начальнікам абласнога аддзела НКВД у гор. Беластоку.

— Тав. Гладкоў, — гаворыць т. Нікіфараў, — безумоўна, апраўдае наша давер'е, ён непахісны, стойкі чэкіст, які будзе адстайваць кроўныя інтарэсы працоўных, выконваць волю мас.

У сваім рашэнні чыгуначнікі просяць тав. Гладкова даць сваю згоду балатавацца па Ломжынскай гарадской выбарчай акрузе № 332.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ ПЕНЬКІ-БАРАВОЕ, ЕДВАБНАЎСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАНА КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Камароўская Вера Александраўна

(На сходзе прысутнічала 80 чалавек)

З вялікім уздымам прайшоў сход сялян вёскі Пенькі-Баравое, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Сход аднадушна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Камароўскую Веру Александраўну, 1900 года нараджэння, батрачку, па нацыянальнасці польку. Тав. Камароўская праводзіць вялікую грамадскую работу ў вёсцы.

На адбыўшымся агульным сходзе гарадскога пасёлка Едвабна, на якім прысутнічала 500 чалавек, аднагалосна была падтрымана кандыдатура тав. Камароўскай Веры Александраўны. Агульны сход звярнуўся да яе з просьбай даць сваю згоду балатавацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе №331.

НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ ГРАМАДЗЯН г. РАЙГОРАДА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Кільбін Александр Ануфрыевіч

(На сходзе прысутнічала 400 чалавек)

Агульны сход выбаршчыкаў гор. Райгорада па прапанове селяніна Перкаля Давіда вылучыў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Кільбіна Александра Ануфрыевіча.

Кандыдатуру тав. Кільбіна падтрымалі ў сваіх выступленнях Буднікаў, Альберт і Забельскі.

У прынятай пастанове запісана: „Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Кільбіна Александра Ануфрыевіча, 1898 года нараджэння, члена ВКП(б), беларуса, сакратара Граеўскага райкома партыі. Прасіць тав. Кільбіна даць сваю згоду для балатыроўкі па выбарчай акрузе № 327".

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСАК АЛЕКСІНА, ГРОДЗСК І ДАЛУБАВА, БРАНСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Кавальчук Пётр Францавіч

(На сходзе прысутнічала 95 чалавек)

Агульны сход сялян вёсак Алексіна, Гродзск і Далубава аднадушна вылучыў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Кавальчука Пятра Францавіча. Тав. Кавальчук працуе членам сялянскага камітэта, дэпутат Народнага Сабрання, член Паўнамоцнай Камісіі, па нацыянальнасці паляк. 22 годы працаваў батраком у маёнтку Мень.

На сходзе прафсаюзных арганізацый гор. Бранска, на якім прысутнічала 170 чалавек, аднагалосна была падтрымана кандыдатура тав. Кавальчука Пятра Францавіча.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ СТУДЗЯНКА, БЕЛАСТОЦКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Ігнатовіч Іван Вікенцьевіч

(На сходзе прысутнічала 575 чалавек)

У вёсцы Студзянка адбыўся шматлюдны сход сялян, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. На сходзе выступіў селянін тав. Жукоўскі, які ўнёс прапанову вылучыць кандыдатам у дэпутаты тав. Ігнатовіча Івана Вікенцьевіча, беларуса, селяніна-бедняка, члена калгаса імені Варашылава. Агульны сход падтрымаў гэту прапанову і просіць тав. Ігнатовіча даць сваю згоду балатавацца па Васількаўскай выбарчай акрузе № 357.

НА СХОДЗЕ СЯЛЯН ВЁСКІ НЕЧКАВА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Шумскі Станіслаў Андрэевіч

(На сходзе прысутнічала 140 чалавек)

Па прапанове тав. Скуткевіча агульны сход сялян вёскі Нечкава, Граеўскага раёна, аднагалосна вылучыў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Шумскага Станіслава Андрэевіча.

Тав. Шумскі 1895 года нараджэння, паляк па нацыянальнасці, паходзіць з сялян-батракоў, беспартыйны, дэпутат Народнага Сабрання, зараз працуе старшынёй сялянскага камітэта вёскі Творкі. Актыўна ўдзельнічае ва ўсіх мерапрыемствах совецкай улады.

Сход просіць тав. Шумскага даць сваю згоду балатавацца па Шчучынскай выбарчай акрузе № 328.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ УДЗЕНЬКОНЬ—I, ЗАМБРОЎСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАНА КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Мазалеўская Ольга Кірылаўна

(На сходзе прысутнічала 400 чалавек)

З вялікім адабрэннем сход сялян вёскі Удзенькoнь-І сустрэў прапанову селяніна Заблеўскага Франца аб вылучэнні кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Мазалеўскай Ольгі Кірылаўны. Сход аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Мазалеўскую Ольгу Кірылаўну і прасіць яе даць згоду балатавацца па выбарчай акрузе № 336.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ ГОЖА, ГРОДНЕНСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Мядзведзеў Нікіфар Васільевіч

(На сходзе прысутнічала 136 чалавек)

У вёсцы Гожа адбыўся сход сялян, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Слова прадастаўляецца селяніну Казімірчыку Б. С.

Я прапаную, — гаворыць тав. Казімірчык, — вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР аднаго з лепшых сыноў нашага народа тав. Мядзведзева Н. В., члена партыі з 1917 года, двойчы ордэнаносца, удзельніка баёў за вызваленне працоўных Заходняй Беларусі.

Агульны сход аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Мядзведзева Нікіфара Васільевіча і звярнуўся да яго з просьбай даць сваю згоду балатавацца па выбарчай акрузе № 372.

НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ ГРАМАДЗЯН ГОР. ЧЫЖАВА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Касцюк Самуіл Сямёнавіч

(На сходзе прысутнічала 450 чалавек)

На агульным сходзе грамадзян г. Чыжава, прысвечаным вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР, з прапановай выступіў настаўнік тав. Кляр.

— Я прапаную, — гаворыць ён, — вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Касцюка Самуіла Сямёнавіча, нараджэння 1907 года, беларуса, члена ВКП(б), сакратара Беластоцкага абкома партыі.

Сход аднадушна прыняў пастанову: „Вылучыць тав. Касцюка кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР і прасіць яго даць згоду для балатыроўкі па Чыжаўскай выбарчай акрузе № 338".

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ СВІРЫДЫ БРАНСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Мураўскі Александр Іванавіч

(На сходзе прысутнічала 100 чалавек)

Сход сялян вёскі Свірыды вылучыў сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Мураўскага Александра Іванавіча, 1901 года нараджэння, селяніна бедняка, па нацыянальнасці паляк, паходзіць з вёскі Алексіна, дэпутат Народнага Сабрання. Зараз тав. Мураўскі вылучан старшынёй Алексінскага сельсовета.

На сходах сялян вёсак Даманава, Вышкі, Кольніца і Малешы падтрымана кандыдатура тав. Мураўскага Александра Іванавіча.

КАЛЕКТЫВАМ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ЧЫГУНАЧНАГА ВУЗЛА ГОР. ВАЛКАВЫСКА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Крук Сцяпан Леонцьевіч

(На сходзе прысутнічала 500 чалавек)

З вялікім уздымам прайшоў сход рабочых і служачых чыгуначнага вузла гор. Валкавыска, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Сход аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Крука Сцяпана Леонцьевіча. Працуючы токарам Валкавыскага дэпо, тав. Крук паказвае большавіцкія ўзоры работы. Ён з'яўляецца дэпутатам Народнага Сабрання. Сход пастанавіў прасіць тав. Крука даць згоду балатавацца па выбарчай акрузе № 378.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСАК ДАМАНАЎКА, ДРАГІЧАНЫ, ХАРУЖАНЦЫ, БОГДЗІ І ТРУНЦЫ ВАЛКАВЫСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Банцыраў Ігнат Акімавіч

(На сходзе прысутнічала 500 чалавек)

На сходзе сялян вёсак Даманаўка, Драгічаны, Харужанцы, Богдзі і Трунцы аднадушна вылучан кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР Банцыраў Ігнат Акімавіч.

Сяляне звярнуліся да яго з просьбай даць сваю згоду балатавацца у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 379.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ КАЛАКІ, ЗАМБРОЎСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Бялы Павел Іванавіч

(На сходзе прысутнічала 350 чалавек)

Сяляне вёскі Калакі, Замброўскага раёна, аднадушна вылучылі кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Бялага Паўла Іванавіча. Тав. Бялы — селянін-бядняк, працуе старшынёй валаснога камітэта.

Агульны сход звярнуўся да яго з просьбай даць сваю згоду балатавацца па выбарчай акрузе № 337.

НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ РАБОЧЫХ, ІНЖЫНЕРНА-ТЭХНІЧНЫХ РАБОТНІКАЎ І СЛУЖАЧЫХ 3-ГА ТЭКСТЫЛЬНАГА КАМБІНАТА ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Тупіцын Міхаіл Нікалаевіч

(На сходзе прысутнічала 450 чалавек)

Учора адбыўся агульны сход рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых 3-га тэкстыльнага камбіната гор. Беластока, прысвечаны вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Слова для прапановы атрымаў начальнік прадзільнага цэха тав. Пісарэвіч Уладыслаў. Ён гаворыць:

— Я прапаную вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Тупіцына Міхаіла Нікалаевіча, вернага сына комуністычнай партыі, дастойнага сына народа.

З падтрыманнем кандыдатуры тав. Тупіцына выступілі ткач Клас Хаім, старшыня фабкома Пучынскі і рабочы Несцярук.

Сход аднадушна прыняў пастанову, у якой гаворыцца: „Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Тупіцына Міхаіла Нікалаевіча, 1906 года нараджэння, члена ВКП(б), працуючага з 1933 года на адказнай партыйнай рабоце, зараз сакратар Беластоцкага гаркома партыі. Прасіць тав. Тупіцына даць сваю згоду для балатыроўкі па Фабрычнай выбарчай акрузе № 350.

ІНТЭЛІГЕНЦЫЯЙ ПАСЕЛКА САКОЛЫ, РАБОЧЫМІ І СЛУЖАЧЫМІ СТАНЦЫІ САКОЛЫ ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Дуброўскі Дзімітрый Георгіевіч

(На сходзе прысутнічала 240 чалавек)

З вялікім уздымам прайшоў сход у пасёлку Саколы па вылучэнню кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Тав. Сержанава ўносіць прапанову, каб вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Дуброўскага Дзімітрыя Георгіевіча. Усе прысутныя аднадушна падтрымалі гэту прапанову.

У сваёй пастанове сход запісаў: „Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Дуброўскага Дзімітрыя Георгіевіча, члена ВКП(б), ордэнаносца, удзельніка баёў ля возера Хасан, актыўнага ўдзельніка баёў з белапалякамі ў час вызваленчага паходу Чырвонай Арміі. Агульны сход просіць тав. Дуброўскага даць згоду балатавацца па выбарчай акрузе № 347".

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ КУДРЫЦЫ, КРЫНКАЎСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Чэкель Владзімір Андрэевіч

(На сходзе прысутнічала 250 чалавек)

У вёсцы Кудрыцы адбыўся агульны сход сялян, прысвечаны вылучэнню кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР. Сяляне аднагалосна пастанавілі вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Чэкеля Владзіміра Андрэевіча, селяніна-бедняка.

Сяляне просяць тав. Чэкеля даць сваю згоду балатавацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 376.

Такі-ж сход сялян адбыўся ў вёсках Парэчча, Ураны, а таксама сход інтэлігенцыі гор. Крынкі. На сходах аднагалосна падтрымана кандыдатура тав. Чэкеля Владзіміра Андрэевіча.

КАЛЕКТЫВАМ РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ ЦЭМЕНТНАГА ЗАВОДА «РОСІ», ВАЛКАВЫСКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАНА КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Смаржко Ніна Віктараўна

(На сходзе прысутнічала 400 чалавек)

Рабочыя і служачыя цэментнага завода „Росі" аднагалосна пастанавілі вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Смаржко Ніну Віктараўну. Тав. Смаржко нарадзілася ў 1915 годзе, работніца - комсамолка, працуе сакратаром комсамольскай арганізацыі завода. Сход просіць яе даць згоду балатавацца па выбарчай акрузе № 380.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСАК ГРЫЦЭВІЧЫ І КРАСНАЕ, СВІСЛАЦКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Болтрык Нікалай Нікалаевіч

(На сходзе прысутнічала 85 чалавек).

На адбыўшымся агульным сходзе сялян вёсак Грыцэвічы і Краснае аднадушна вылучан кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Болтрык Нікалай Нікалаевіч. Тав. Болтрык быў палітзняволены, селянін, зараз працуе старшынёй Тарнопальскага валаснога камітэта.

Кандыдатура тав. Болтрыка Нікалая Нікалаевіча аднадушна падтрымана агульным сходам сялян вёскі Глушкі, на якім прысутнічала 87 чалавек, і агульным сходам сялян вёсак Агароднікі і Галадубы, на якім прысутнічала 160 чалавек.

АГУЛЬНЫМ СХОДАМ СЯЛЯН ВЁСКІ АЗЁРКІ, ПАРЭЦКАГА РАЁНА, ВЫЛУЧАН КАНДЫДАТАМ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Суравец Браніслаў Казіміравіч

(На сходзе прысутнічала 150 чалавек)

Сход сялян вёскі Азёркі аднагалосна вылучыў кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Сураўца Браніслава Казіміравіча, 1905 года нараджэння, беларуса селяніна-бедняка, які зараз працуе старшынёй сялянскага камітэта вёскі Азёркі.

На сходах сялян вёсак Гадуны, Салаці, Марціканцы, Парэчча і мястэчка Парэчча была аднадушна падтрымана кандыдатура тав. Сураўца Браніслава Казіміравіча.

У ДАПАМОГУ ПРАПАГАНДЫСТАМ

УТВАРЭННЕ І ГЕРАІЧНАЯ АБАРОНА БЕЛАРУСКАЙ ССР

I.

Вялікая соцыялістычная рэвалюцыя, знішчыўшы панаванне памешчыкаў і капіталістаў, прынесла шматлікім народам Совецкай краіны поўнае вызваленне ад нацыянальнага прыгнечання, якому яны падвяргаліся з боку царскага, а затым буржуазнага Часовага ўрада.

Бальшавіцкая партыя з самага пачатку свайго існавання напісала на сваім сцягу права народаў на свабоднае самавызначэнне, аж да аддзялення.

У эпоху пралетарскіх рэвалюцый нацыянальнае пытанне набыло выключнае значэнне. Падрыхтоўваючы масы да штурму капіталізма, бальшавіцкая партыя стварала тыл для соцыялістычнай рэвалюцыі. Народы, якія падымаліся супроць нацыянальнага прыгнечання, былі яе рэзервамі.

Яшчэ задоўга да соцыялістычнай рэвалюцыі ў Расіі Ленін і Сталін тэарэтычна распрацавалі нацыянальнае пытанне і выхоўвалі бальшавіцкую партыю на правільным разуменні ўсяго значэння яго. Ленін і Сталін непасрэдна кіравалі практычным вырашэннем нацыянальнага пытання на неабсяжнай тэрыторыі нашай краіны. Яны сталі ля калыскі ўтвараўшыхся Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Правядзеннем нацыянальнай палітыкі з першага дня існавання совецкай улады кіраваў таварыш Сталін, які ўзначальваў народны камісарыят па справах нацыянальнасцей. Ён прадаўжаў кіраваць гэтай справай і ў грозныя моманты для жыцця краіны, калі, па рашэнню Цэнтральнага Камітэта Комуністычнай партыі, накіроўваўся на самыя небяспечныя франты для арганізацыі ваеннага разгрому інтэрвентаў і белагвардзейцаў.

II.

У «Дэкларацыі праў народаў Расіі» совецкі ўрад заявіў, што нацыянальная палітыка, якая праводзілася царскім і Часовым урадамі, «павінна быць заменена палітыкай дабраахвотнага і чэснага саюза народаў Расіі».

«Недастойнай палітыцы хлусні і недавер'я, прыдзірак і правакацыі,—абвяшчала Дэкларацыя,—павінен быць пакладзен канец. Ад гэтага часу (пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі, — О. Ш) яна павінна быць заменена адкрытай і чэснай палітыкай, вядучай да поўнага ўзаемнага давер'я народаў Расіі. Толькі ў рэзультаце такога давер'я можа злажыцца чэсны і моцны саюз народаў Расіі. Толькі ў рэзультаце такога саюза могуць быць спаяны рабочыя і сяляне народаў Расіі ў адну рэвалюцыйную сілу, здольную ўстаяць супроць усякіх замахаў з боку імперыялістычна-анексіяністкай буржуазіі». (Цыт. па кнізе І. Сталіна «Артыкулы і прамовы аб Украіне», стар. 13).

У рэзультаце Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыі, перамог соцыялізма і ажыццяўлення совецкай уладай ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі была створана магутная многанацыянальная соцыялістычная дзяржава—Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Гэтаму папярэднічаў перыяд арганізацыі і росту Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік. Дзякуючы перамозе Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыі рад народаў, насяляўшых Расію, упершыню ў гісторыі набыў дзяржаўнасць. Так нарадзілася і Беларуская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка.

У бліжэйшыя два тыдні пасля перамогі рэвалюцыі ў цэнтры на ўсёй тэрыторыі Беларусі, апрача абласцей, занятых у час імперыялістычнай вайны германскімі войскамі, устанавілася ўлада советаў. Буйнейшыя дзеячы бальшавіцкай партыі— Я. М. Свердлоў, М. В. Фрунзе, С. Орджанікідзе, Л. М. Кагановіч—непасрэдна кіравалі барацьбой за ўладу советаў у Беларусі.

Совецкая ўлада ў Беларусі ўстанаўлялася і ўмацоўвалася ў жорсткай барацьбе з беларускімі буржуазнымі нацыяналістамі і польскай буржуазна-памешчыцкай акупацыяй. Контррэвалюцыйная Беларуская рада, арганізаваная летам 1917 г. буржуазнымі нацыяналістамі, павяла шалёную барацьбу за аднаўленне буржуазна-памешчыцкага панавання ў Беларусі.

Беларускія нацыяналісты на словах прызнавалі совецкую ўладу, на справе-ж вялі здрадніцкую палітыку, раздуваючы ў працоўных масах шавіністычны чад і прабуючы адкалоць іх ад совецкай улады.

Скліканы Беларускай радай у канцы снежня 1917 г. беларускі кангрэс прабаваў аб'явіць сябе вышэйшай уладай на Беларусі. Але беларускія нацыяналісты не знайшлі падтрымання ў масах. Пасля разгону беларускага кангрэса Советам народных камісараў Заходняй вобласці Беларуская рада стала на шлях контррэвалюцыйнай падпольнай барацьбы супроць совецкай улады: яна арганізоўвала кулацкія банды, звязалася з вярхоўным ваенным польскім камітэтам.

Для барацьбы з рэвалюцыяй і з рабочымі і сялянамі Беларуская рада выкарыстала польскі корпус генерала Доўбар-Мусніцкага—польскія легіёны.

Чырвонагвардзейскія атрады нанеслі польскім легіёнам рад паражэнняў, але канчаткова разбіць іх не ўдалося. 18 лютага 1918 г. пачалося наступленне войск германскага імперыялізма. Польскія легіёны дапамаглі германскім войскам узяць Мінск і ў першыя-ж дні нямецкай акупацыі занялі рад раёнаў (Бабруйск—Рагачоў), дзе грабілі і расстрэльвалі рабочых і сялян, аднаўлялі буржуазна-памешчыцкую ўладу.

Пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі беларускі народ падняўся супроць інтэрвентаў. У барацьбе з беларускімі нацыяналістамі, польскімі і нямецкімі захватчыкамі ўмацаваліся ўзаемнае давер'е і сувязь паміж беларускім і рускім народамі. Беларускім нацыяналістам, якія прабавалі адарваць Беларусь ад Совецкай Расіі, быў нанесен сакрушальны ўдар.

Таварыш Сталін у лютым 1919 г. так ахарактарызаваў гэты працэс: «З аднаго боку, на акраінах, адчуўшых усе жахі акупацыі, узнікла магутная цяга да рускага пралетарыята і да яго форм дзяржаўнага будаўніцтва, цяга, перад якой пасуюць сепаратысцкія патугі акраінных урадаў. З другога боку, не стала больш той знешняй узброенай сілы (аўстра - германскі імперыялізм), якая перашкаджала працоўным масам акупіраваных абласцей выявіць сваю ўласную палітычную фізіяномію». (І. Сталін, «Артыкулы і прамовы аб Украіне», стар. 71).

Імкненне беларускага народа да цеснага саюза з рускім народам і цяганне да Расійскай Совецкай Федэратыўнай Соцыялістычнай Рэспублікі знайшлі сваё яркае выражэнне ў шматлікіх зваротах беларускіх працоўных да совецкага ўрада за абаронай ад акупантаў і з пратэстам супроць акупацыі раёнаў Беларусі. Чырвонай ніткай праз усе пастановы сходаў працоўных Беларусі праходзяць глыбокае давер'е да рабоча-сялянскага совецкага ўрада, моцная цяга да рускага пралетарыята.

Чырвоная Армія з дапамогай працоўных Беларусі ачысціла Беларусь ад германскіх акупацыйных войск. Была вызвалена і частка Беларусі, акупіраваная ў час імперыялістычнай вайны. Пасля вызвалення ад нямецкіх акупантаў велізарны рэвалюцыйны ўздым сярод беларускіх працоўных мас прывёў да ўтварэння БССР.

III.

24 снежня 1918 г. таварыш Сталін выклікаў з Смаленска да прамога провада А. Ф. Мяснікова, старшыню абласнога камітэта РКП(б) Паўночназаходняй вобласці (стары бальшавік, які потым загінуў у час паветранай катастрофы). Размова адбылася 25 снежня. Таварыш Сталін паведаміў Мяснікову пра рашэнне ЦК РКП(б) аб утварэнні БССР і выклікаў у Маскву прадстаўніка абласнога камітэта.

Таварыш Сталін меў на мэце прыехаць на VI абласную канферэнцыю бальшавікоў Паўночназаходняй вобласці і прапанаваў адкласці яе з 27 на 30 снежня, каб да канферэнцыі дагаварыцца з комуністамі-беларусамі і абласным выканаўчым камітэтам Заходняй вобласці па ўсіх пытаннях утварэння БССР і Часовага беларускага совецкага ўрада. Ён даў указанне, каб Ковенская і Віленская губерні адышлі да літоўскага совецкага ўрада. Таварыш Сталін высунуў таксама асноўныя прынцыпы ўтварэння БССР і работы комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі.

Указанні таварыша Сталіна былі абмеркаваны на партыйнай нарадзе з удзелам А. Ф. Мяснікова. На аснове іх праводзілася будаўніцтва БССР і КП(б)Б, імі кіраваліся бальшавікі Беларусі ў барацьбе супроць буржуазных беларускіх нацыяналістаў.

Урад БССР павінен быў складацца з 15 чалавек (потым састаў урада быў расшыран да 17 чалавек). Таварыш Сталін займаўся і персанальным падборам людзей.

Стваралася Цэнтральнае бюро комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларускай рэспублікі. Старшыня Цэнтральнага бюро з'яўляўся прадстаўніком ЦК партыі і совецкага ўрада. Таварыш Сталін рэдагаваў маніфест Часовага рабоча-сялянскага совецкага ўрада Беларусі і ўнёс у яго рад важных папраўак.

Калі члены Часовага совецкага беларускага ўрада выехалі ў Смаленск, таварыш Сталін пісаў Мяснікову: «Сёння выязджаюць у Смаленск беларусы. Вязуць з сабой маніфест. Просьба ЦК партыі і Леніна прыняць іх як малодшых братоў, можа быць яшчэ неапытных, але гатовых аддаць сваё жыццё партыйнай совецкай рабоце» (Белпартархіў. ф. 2037, с. № 1386, л. 1).

ЦК партыі прапанаваў абласному камітэту абмеркаваць пытанне аб утварэнні БССР, не трацячы часу.

30 снежня сабралася пазачарговая VI канферэнцыя Паўночназаходняй вобласці. На ёй былі поўнасцю прадстаўлены ўсе комуністычныя арганізацыі, што знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі і Смаленскай губерні.

Канферэнцыя аб'явіла сябе І з'ездам КП(б)Б і прыняла рашэнне: лічыць неабходным аб'явіць самастойную соцыялістычную рэспубліку Беларусі на тэрыторыі Мінскай, Гродненскай, Магілёўскай, Віцебскай і Смаленскай губерань.

А. Ф. Мясніков у сваім дакладзе падкрэсліваў, што ўтварэнне БССР неабходна, каб процістаяць націску новага ворага—імперыялістаў Антанты, адстаяць заваяванні соцыялістычнай рэвалюцыі і свабоду прыгнечаных раней нацыянальнасцей.

Канферэнцыя звярнулася да ЦК РКП(б) з наступнай тэлеграмай: «VI Паўночна-заходняя абласная канферэнцыя РКП(б), прыняўшы пастанову аб неабходнасці выдзялення Беларусі ў самастойную рабоча - сялянскую совецкую рэспубліку, аб'явіла сябе І з'ездам комуністычнай партыі бальшавікоў Беларускай рэспублікі, на што просіць нашай санкцыі. Аб'яўляючы комуністычную партыю Беларускай рэспублікі, з'езд падкрэслівае сваю непарыўную, ідэйную, тактычную і арганізацыйную сувязь з РКП, якая стварылася доўгімі гадамі сумеснай работы». (Архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі, ф. 1235, оп. 52, арх. 315, л. 240.1918).

У сваёй адозве да рабочых, батракоў, сялян і Чырвонай Арміі І с'езд комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі падкрэсліваў вызваленчую ролю Чырвонай Арміі, якая прынесла чырвоны сцяг соцыялізма з края ў край змучанай Беларусі.

З'езд заяўляў, што працоўныя Беларусі не жадаюць ведаць іншай улады, як уладу Советаў, якая з'яўляецца ўладай рабочых, батракоў і сялян. Ім ненавісна ўлада памешчыкаў Беларускай рады, якой працоўны народ проціпастаўляе сваю рабоча-сялянскую ўладу, сваю Совецкую рэспубліку.

З'езд комуністаў Беларускай рэспублікі вітаў Цэнтральны Камітэт партыі і Совет народных камісараў РСФСР і падкрэсліваў цесную сувязь з ёю Совецкай Беларусі, а таксама адзінства класавых інтарэсаў пралетарыята.

У гэты-ж дзень быў сфарміраван Часовы рабоча-сялянскі ўрад БССР.

БССР утварылася з раёнаў Мінскага, Смаленскага, Віцебскага, Магілеўскага, Гомельскага, Гродненскага, Баранавіцкага, Беластоцкага. Расколаты германскай акупацыяй, беларускі народ злучыўся ў нетрах Беларускай совецкай рэспублікі.

Ажыццяўленне ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі і ўтварэнне БССР нанесла сакрушальны ўдар беларускім буржуазным нацыяналістам. Частка з іх, скрыўшы сваю варожую сутнасць, прабралася ў комуністычную партыю і ў вышэйшыя органы БССР, каб знутры праводзіць сваю падрыўную, нацыяналістычную палітыку. Нацыяналісты, якія былі замаскіраваліся, патрабавалі незалежнасці беларускага ўрада ад Цэнтральнага бюро комуністычнай партыі (бальшавікоў) Беларусі.

Замаскіраваныя ворагі — Жылуновіч і яго група — проціпаставілі сябе Цэнтральнаму бюро КП(б)Б. Яны заявілі, што не жадаюць падпарадкоўвацца Цэнтральнаму бюро, як партыйнаму цэнтру рэспублікі, узначальваемаму ЦК партыі, што яны выходзяць з Цэнтральнага бюро і адмаўляюцца ад апублікавання маніфеста. Прыкрываючыся высокім званнем членаў партыі бальшавікоў, нацыяналісты нагла вялі сябе: арганізоўвалі асобныя нарады, ставілі ультыматумы Цэнтральнаму бюро. Цэнтральнае бюро бальшавікоў бачыла, што ўсе гэтыя патрабаванні выцякаюць з самага непрыкрытага нацыяналізма, і Мясніков запрасіў указання таварыша Сталіна. Таварыш Сталін патрабаваў ад Жылуновіча і яго групы беспярэчлівага падпарадкавання рашэнню Цэнтральнага Камітэта партыі. Ён збіраўся 1 студзеня выехаць у Смаленск. Але з усходу пагражаў небяспечны вораг: у снежні Перм была занята Калчаком. Цэнтральны Камітэт і Совет абароны накіравалі таварыша Сталіна і Ф. Э. Дзяржынскага расследваць прычыны падзення Пермі і прыняць меры да выпраўлення становішча на фронце.

1 студзеня Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі совецкі ўрад Беларусі апублікаваў маніфест. На ўсёй тэрыторыі Беларусі ўстанаўлялася совецкая ўлада; улада нямецкіх і польскіх акупантаў і Украінскай цэнтральнай рады, якая яшчэ захавалася ў некаторых паўднёвых раёнах, аб'яўлялася скасаванай; прадажная буржуазная Беларуская рада была аб'яўлена па-за законам; усе землі памешчыкаў, манастыроў, касцёлаў станавіліся народным здабыткам; чыгункі, пошта, тэлеграф, банкі, фабрыкі і заводы былі нацыяналізаваны, быў устаноўлен васьмігадзінны рабочы дзень і ўведзены ў дзеянне совецкія законы па забеспячэнню рабочага класа.

Маніфест падкрэсліваў, што беларускі народ вызваліўся ад панавання памешчыкаў і капіталістаў і ад нацыянальнага прыгнечання дзякуючы Вялікай соцыялістычнай рэвалюцыі. Часовы рэвалюцыйны совецкі ўрад Беларусі заклікаў народ стаць на абарону БССР.

Чырвонай ніткай праходзіла праз маніфест ідэя салідарнасці і непарушнай сувязі беларускага і рускага народаў.

Па ўсёй тэрыторыі Беларусі закіпела рэвалюцыйная творчасць.

Створаныя ў вызваленых ад нямецкіх акупантаў мясцовасцях: Мінскім, Гродненскім, Беластоцкім, Пінскім, Брэсцкім, Валкавыскім і іншых раёнах — рэўкомы вялі работу па падрыхтоўцы з'езду советаў і стварэнню совецкай улады.

1 лютага Усерасійскі Цэнтральны выканаўчы камітэт прызнаў незалежнасць БССР. Вітаючы працоўных Беларусі, прэзідыум пастанавіў: «Выходзячы з прынцыпа поўнага і сапраўднага самавызначэння працоўных мас усіх краін, Прэзідыум Усерасійскага Цэнтральнага выканаўчага камітэта яшчэ раз пацвярджае, што факт прызнання незалежнасці Беларусі, як і іншых знаходзячыхся ў тым-жа становішчы краін, да старой царскай імперыі не накладвае на яе ніякіх абавязацельстваў».

Прэзідыум ВЦВК выказваў цвёрдую ўпэўненасць, што «толькі цяпер, на глебе прызнання поўнай свабоды самавызначэння і пераходу ўлады ў рукі рабочага класа, ствараецца дабравольны і непарушны саюз працоўных усіх нацый, насяляючых тэрыторыю былой царскай імперыі». Прэзідыум ВЦВК заяўляў аб гатоўнасці Совецкай Расіі аказаць «усякую дапамогу і падтрыманне працоўным масам Беларусі ў іх барацьбе супроць панавання эксплаатацыі і прыгнечання і ў абароне іх свабоды і незалежнасці ад спроб замежных заваяванняў». («Известия ВЦИК» ад 5 лютага 1919 г.).

2 лютага 1919 г. у Мінску адкрыўся І з'езд рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў Беларусі. На з'езд прыбыло 230 дэлегатаў з рашаючым голасам, з іх 213 бальшавікоў і 17 спачуваючых. Па губернях месцы размяркоўваліся так: ад Мінскай — 121, Гродненскай — 11, Смаленскай — 48, Магілеўскай — 10 і Віленскай — 25. Працоўныя ўсёй Беларусі прыслалі сваіх прадстаўнікоў на з'езд.

Першым выступіў Я. М. Свердлоў, які вітаў прадстаўнікоў беларускага народа ад імені Усерасійскага Цэнтральнага выканаўчага камітэта. «Вам, — гаварыў ён, — больш чым каму-небудзь іншаму прышлося перацярпець ад гнёту чужаземнай акупацыі, але і пад пятою таржаствававаўшага тады імперыялізма вы не пакідалі сваёй работы над падрыхтоўкай совецкага ладу ў Беларусі. Разам з намі вы ведалі, што імперыялізм будзе зломлен і пераможа сусветная соцыялістычная рэвалюцыя, адновіцца совецкая ўлада ў часова падняволеным краі.. У нас ужо ёсць рэвалюцыйны вопыт. Гэта дае нам упэўненасць, што раны, нанесеныя краю імперыялістамі, будуць залечаны. Мы дапаможам вам сваім вопытам, набытым за мінулы год. Чым хутчэй будуць залечаны гэтыя раны, тым цясней будзе еднанне паміж рэвалюцыйнымі пралетарыятам Беларусі, Літвы і Расіі».

Я. М. Свердлоў аб'явіў рашэнне ВЦВК аб прызнанні незалежнасці БССР. «Ніхто, — закончыў ён сваю прамову, — не павінен забываць аб неабходнасці цеснай спайкі, дасягнутай намі шляхам сумеснай дружнай работы ўсіх рэвалюцыйных сіл рускага пралетарыята і сялянства і рускай брацкай крыві. Рускі пралетарыят ніколі не забудзе таго, што вы першымі прынялі на сябе ўдары і націск германскага імперыялізма, спыніўшы яго прасоўванне ўглыб краіны». (Белпартархіў, ф. 2037, с. № 1555).

І Усебеларускі з'езд советаў абвясціў Беларускую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку, прыняў канстытуцыю і пастанавіў пачаць перагаворы з РСФСР аб устанаўленні федэратыўнай сувязі паміж абодвума рэспублікамі.

З'езд звярнуўся да ўсіх брацкіх незалежных соцыялістычных рэспублік узяць прыклад з БССР. («Жизнь национальностей» № 5 (13) ад 16 лютага 1919 года).

Гэта была яркая дэманстрацыя брацкага давер'я паміж народамі Совецкай краіны, давер'я, узнікшага дзякуючы нацыянальнай палітыцы бальшавіцкай партыі і непарушнай сувязі беларускага народа з Совецкай Расіяй.

Утварэнне БССР было бліскучым таржаством ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Таварыш Сталін у артыкуле «Палітыка ўрада па нацыянальнаму пытанню» пісаў 9 лютага 1919 г. «...чым больш утапічныя планы нашых контррэвалюцыянераў, тым больш рэальна вырысоўваецца палітыка совецкай улады, цалкам апіраючаяся на ўзаемнае брацкае давер'е народаў Расіі. Больш таго, яна, гэтая палітыка, пры цяперашняй міжнароднай абстаноўцы з'яўляецца адзіна рэальнай, адзіна рэвалюцыйнай.

Аб гэтым красамоўна сведчыць хоць-бы апошняя дэкларацыя з'езда советаў Беларускай рэспублікі аб устанаўленні федэратыўнай сувязі з Расійскай совецкай рэспублікай. Справа ў тым, што Беларуская совецкая рэспубліка, прызнаная нядаўна незалежнай, цяпер на з'езде сваіх советаў дабравольна абвяшчае саюз з Расійскай совецкай рэспублікай. З'езд советаў Беларусі ў сваёй дэкларацыі ад 3 лютага заяўляе, «што толькі свабодны дабравольны саюз працоўных цяпер незалежных совецкіх рэспублік можа забяспечыць таржаство рабочых і сялян у іх барацьбе з усім астатнім, капіталістычным светам».

«Дабравольны саюз працоўных усіх незалежных совецкіх рэспублік.. Гэта іменна той шлях аб'яднання народаў, аб якім увесь час цвярдзіла совецкая ўлада, і які дае цяпер свае добрыя рэзультаты..


Так ад распаду старога імперыялісцкага адзінства праз незалежныя совецкія рэспублікі народы Расіі прыходзяць да новага дабравольнага брацкага адзінства.

Шлях гэты, несумненна, не з самых лёгкіх, але ён — адзіны шлях, які вядзе да моцнага, соцыялістычнага саюза працоўных мас нацыянальнасцей Расіі». (І. Сталін, «Артыкулы і прамовы аб Украіне», стар. 72—73).

К канцу 1918 г. была ачышчана ад нямецкіх акупантаў і Літва. Пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі Советы устанавілі сваю ўладу ў Вільне, Шаўлях, Паневежы. а таксама і ў Коўна.

16 снежня ў Вільне, на першым пасяджэнні Совета рабочых дэпутатаў, быў арганізаван Часовы рабоча-сялянскі ўрад Літвы. 22 снежня ВЦВК прызнаў незалежнасць Літоўскай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі.

(Працяг у наступным нумары).



Батарея на огневой позиции. На переднем плане командир передового огневого взвода младший лейтенант тов. Козлов. Фото Б. Ярославцева.

НА ЗАПАДНОМ ФРОНТЕ

Париж, 19 февраля. (ТАСС). Официально сообщается, что вчера «после сильной минометной подготовки противник атаковал один из французских портов восточнее Мозеля, но был отбит. К востоку от Нид один из наших отрядов натолкнулся на засаду противника и понес потери. Между укреплениями вдоль берегов Рейна происходит перестрелка».

Брюссель, 19 февраля. (ТАСС). Газета «Журналь» сообщает в сегодняшнем военном обзоре: «К западу от Вогезов французская артиллерия рассеяла несколько отрядов немецких рабочих, производивших в этом районе различные фортификационные работы. Французская авиация производила глубокие разведывательные полеты над Германией, Немцы — над нашими линиями».

ВОЙНА НА МОРЕ

Лондон, 19 февраля. (ТАСС). Английский пароход «Барон Эйсла» водоизмещением в 3566 тонн подвергся нападению в Северном море и затонул. Погибли 2 человека.

Английское морское министерство об'явило о торпедировании 6-го английского эсминца «Дэйриг», водоизмещением в 1375 тонн. Из экипажа спасся только один офицер и 4 матроса. Остальные 9 офицеров и 148 матросов пропали без вести. Полагают, что все они погибли.

На-днях потоплены также два шведских парохода «Осмед» и «Лиана».

Нью-Йорк, 19 февраля. (ТАСС). Как передает Ассошиэйтед пресс, в Северном море, наскочив на мину, затонул голландский пароход «Амеланд» водоизмещением в 4600 тонн.

Японский пароход «Рюдзинмару» радировал о том, что возвращаясь домой, он был обыскан вблизи Филиппинских островов командой какого-то военного корабля неизвестной национальности.

Париж. 19 февраля, (ТАСС). «Фелькишер беобахтер» сообщает, что перед приходом в Дарданеллы наскочил на риф английский военный корабль. Судно сильно повреждено.

РАСПРАВА С НЕДОВОЛЬНЫМИ

Стокгольм, 18 февраля. (ТАСС). Вчера руководство шведской социал-демократической партии исключило из партии известную социал-демократку Рут Адлер, выступившую недавно с открытым письмом против предательской политики партийного руководства. Одновременно исключен также известный социал-демократ Нильсон, опубликовавший в коммунистической газете письмо, в котором выступал в защиту Советского Союза.

НАЖИМ ПОДЖИГАТЕЛЕЙ ВОЙНЫ НА ШВЕЦИЮ

Чем яснее вырисовывается масштаб и значение последних побед Красной Армии и перспектива полного разгрома маннергеймовских банд, тем все сильнее и сильнее проявляется лихорадочная активность англо-французской дипломатии в Швеции и Норвегии. В самых различных общественных кругах Швеции проявляется глубокое беспокойство по поводу неприкрытого вмешательства Англии и Франции в политику шведского правительства, вмешательства, имеющего своей прямой и непосредственной целью принудить Швецию отказаться от нейтралитета и вовлечь ее в войну на стороне англо-французского блока.

Как и следовало ожидать, в качестве наиболее циничных и ревностных „борцов“ за выполнение директив своих хозяев выступают шведские реакционеры и прихвостни их лагеря социал-демократов, многие из которых, как это доподлинно известно, уже длительное время состоят на содержании английской разведки.

Провокаторы войны прямо и открыто предлагают двинуть шведские войска в Финляндию.

Тем не менее вся эта шумиха и возня матерых врагов шведского народа и государства не привела к желательным для них результатам. Как известно, на требования Маннергейма немедленно направить шведскую армию в Финляндию правительство Швеции ответило отказом. Тогда вся провокаторская клика развернула кампанию против правительства. За последние дни по прямой указке из Лондона англо-французская агентура в Швеции выбросила лозунг замены правительства Гансона правительством „сильной руки“, т. е. правительством, которое безропотно выполняло бы волю и планы поджигателей войны.

Большинство шведского народа, все здравомыслящие политики отдают себе отчет в том, куда пытаются вовлечь Швецию враги мира, поставившие своей задачей нарушить мирный труд шведского народа и погнать его на войну во имя *империалистических* интересов некоторых держав. „Подавляющее большинство шведского народа, — пишет шведская коммунистическая газета „Ню даг“, — является абсолютным противником всего того, что могло бы вовлечь Швецию в войну. (ТАСС).

Нарушение английскими военными кораблями нейтралитета Норвегии

16 февраля германский торговый пароход „Альтмарк“ проходил через норвежские территориальные воды в сопровождении норвежского миноносца. В это время два английских эсминца сделали попытку задержать германский пароход, но встретив сопротивление со стороны норвежского военного корабля, вынуждены были уйти. Вскоре после того, как германский пароход подошел к берегам Норвегии, в норвежских водах появились английский крейсер и пять эсминцев. Пустив в ход оружие, англичане захватили пароход. Как сообщает германское информационное бюро, английский эсминец открыл ураганный пулеметный огонь по спускающимся на лед и ищущим убежища германским матросам. Число убитых еще не установлено.

Это нарушение норвежского нейтралитета английскими военными кораблями сильно взволновало общественность Норвегии. Норвежское министерство иностранных дел заявило протест английскому правительству. Однако, как полагают в иностранных кругах, Англия отклонила протест Норвегии. (ТАСС).

ЗАЯВЛЕНИЕ ХАМБРО

Осло, 19 февраля. (ТАСС). Норвежское телеграфное агентство передает, что председатель норвежского парламента и председатель иностранной комиссии парламента Хамбро заявил, что нет никакой необходимости указывать на то, что инцидент с германским пароходом «Альтмарк» вызвал в Норвегии сильнейшее недовольство. Действия эскадры английских кораблей в Иосингфиорде являются грубейшим нарушением прав нейтрального государства.

«Для нас,—сказал Хамбро,— трудно понять это наглое нарушение суверенных прав малого государства, которое находится в хороших отношениях с Англией. Я обратил внимание министра иностранных дел Кута на необходимость запросить нейтральные государства группы Осло, не найдут-ли они нужным обсудить вопрос об активном сотрудничестве с тем, чтобы заявить совместный энергичный протест против грубых методов ведения морской войны.

Момент, избранный для этого враждебного акта против Норвегии, имеет особое значение. Мы были накануне заключения торгового соглашения с Англией. Совершенно очевидно, что после этого грубейшего нарушения норвежских прав всякое обсуждение возможностей для торговли и судоходства между обеими странами примет совершенно новую форму. Также очевидно, что это неосмотрительное действие против дружественного малого государства вызовет отклики во всех нейтральных странах и может иметь далеко идущие последствия».

◆ ◆ ◆

Напярэдадні XXII гадавіны РСЧА

Першыя баявыя стрэльбы артылерыстаў

Н-ская часці 18 лютага першы раз у гэтым годзе вышла на баявыя стрэльбы з гармат. Баявой стральбе папярэднічала вялікая падрыхтоўчая работа. Праведзена некалькі выхадаў у поле, добра падрыхтавана матэрыяльная часць, асабовы састаў многа папрацаваў над усваеннем умоў стральбы і мерапрыемстваў для яе выдатнага выканання. Батарэя з батарэяй, узвод з узводам, баец з байцом заключылі паміж сабой дагаворы на соцыялістычнае спаборніцтва і абавязаліся атрымаць выдатную адзнаку на прадстаячых стрэльбах.

На стральбу часць вышла раніцой. 6-кілометравы шлях на палігон пралёг праз глыбокія, па грудзі чалавека, снежныя гурбы. Коні з вялікай цяжкасцю цягнулі гарматы.

Але вось і палігон. Хутка займаюцца агнявыя пазіцыі. На паўтара метра глыбінёй у зямлю вырыты раўкі для стральбы, зроблены снежныя акопы. Сувязісты на лыжах наладжваюць сувязь. Точна і скора зроблены разлікі вымяральнікамі. Сёння страляюць чатыры батарэі.

Першым адкрывае агонь камандзір батарэі старшы лейтэнант Пустовіт. Начальнік штаба часці ставіць перад ім задачу: на ўскраіне гаю „праціўнік“ праводзіць скапленне сіл для атакі — рассеяць „варожую“ пяхоту.

Першы прыстрэлачны знарад пападае точна ў цэль. Батарэя адкрывае агонь з астатніх гармат. Пастаўленая задача выканана выдатна. Пры яе выкананні батарэя зэканоміла чатыры знарады.

Камандзір узвода, малодшы лейтэнант Груданоў страляе першы раз у сваім жыцці. Не гледзячы на гэта, яго каманды былі выключна чоткія, стрэльба ўпэўненая. Задачу падаўлення кулямёга „праціўніка“ ён выканаў выдатна. Выдатную адзнаку на стральбе атрымала і батарэя лейтэнанта Нікіціна, якая выканала задачу падаўлення „варожага“ кулямётнага ўзвода. Добра страляла батарэя лейтэнанта Бобрыкава.

К. Васільеў.

ПА ГОРАДУ І ОБЛАСЦІ

АРЦЕЛІ БЕЛАСТОЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Па Беластоцкай області арганізавана 51 арцель, якія ахапляюць 1.530 чалавек, з іх 18 у Беластоку.

Да канца 1940 года будзе арганізавана 107 арцелей з колькасцю членаў 3.450 чалавек.

Выпуск прадукцыі па гэтых арцелях намячаецца на суму 41 мільён рублёў.

1.000 ЧАЛАВЕК У ПУНКТАХ ЛІКБЕЗА

У Беластоку арганізаван рад пунктаў для ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. 10 такіх пунктаў працуюць на фабрыках і заводах.

Апрача таго, створаны дзве спецыяльныя школы для непісьменных і малапісьменных, дзе займаецца каля 400 чалавек.

Усяго пунктамі лікбеза ахоплена 1000 чалавек.

СЯЛЯНЕ ПРАДАЛІ ДЗЯРЖАВЕ 150 ТОН ЗБОЖЖА

Выбарчая кампанія выклікала вялікі палітычны і вытворчы ўздым сярод сялян Граеўскага раёна. За апошнія 10 дзён сяляне раёна прадалі дзяржаве 150 тон збожжа. Па адной толькі Белдаўскай воласці прадана 50 тон.

Заўтра ў раённы цэнтр прыбывае чырвоны абоз з 90 тонамі збожжа для продажу дзяржаве. Раённыя арганізацыі рыхтуюць дастойную сустрэчу сялянам.

ПОДГОТОВКА КАДРОВ ДЛЯ ЛЕСНОЙ ПРОМЫШЛЕННОСТИ

Белостокские тресты лесной промышленности провели курсы для плановиков. Курсы окончило 60 человек.

Фанерный трест организует курсы для сменных мастеров и для специалистов по технике безопасности и охране труда.

ФАБРИКА МЕТАЛЛИЧЕСКИХ ИЗДЕЛИЙ

Находящаяся в ведении отдела местной промышленности горисполкома фабрика металлических изделий (б. Шварца) вырабатывает арматуру для окон, дверей и другие изделия ширпотреба.

Сейчас на фабрике в два раза увеличилось число рабочих.

Фабрика пока работает на одну смену. Во втором квартале 1940 г. она будет пущена на две смены.

Адказны рэдактар Б. М. Зельманаў

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнога рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята --23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны аблліта № 178.

1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку.